УДК 94(476)"1920/30":378:009

***І.І. Шаўчук***

# ГІСТОРЫКА-НАВУКОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ НА КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ СЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ

У артыкуле праз прызму выканання задання «Гісторыя гуманітарных навук у БССР (1920−1930-я гады)» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава» разглядаецца праца па вывучэнни гісторыі навукі, якая ажыццяўляецца на кафедры гісторыі славянскіх народаў гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.

Вывучэнне праблем гісторыі навукі і вышэйшай школы на кафедры гісторыі славянскіх народаў праводзілася ад пачатку яе існавання з 1992 г., што абумоўлівалася наяўнасцю кваліфікаваных спецыялістаў у дадзенай галіне. І.І. Шаўчуком і А.В. Пятроўскай яшчэ ў 1989 г. абароненыя кандыдацкія дысертацыі, прысвечаныя згаданай тэматыцы: адпаведна «Развитие исторической науки в БССР (1970-е годы)» (НАН Беларусі) і «Реформа системы высшего образования 1969 года в Народной Республике Болгарии» (Маскоўскі дзяржуніверсітэт).

Падчас фармавання кадравага патэнцыялу кафедры на пачатку 1990-х гадоў (загадчык – І.І. Шаўчук) галоўная ўвага надавалася падрыхтоўцы спецыялістаў, якія маглі б аптымальна забяспечыць выкладанне вучэбных дысцыплін, замацаваных за структурным падраздзяленнем гістарычнага факультэта. Разам з тым не пакідаўся па-за ўвагай і зазначаны накірунак навуковых пошукаў. Вынікам сталі абароны дысертацый пэўнага кірунку маладымі супрацоўнікамі, пераважна выпускнікамі гістарычнага факультэта БрДУ: А.А. Савічам «Рэвалюцыйны нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.: гістарыяграфія праблемы» (2002), Н.Я. Дзядзічкінай «Международное научное сотрудничество Академии наук БССР (вторая половина 1950-х − 1980-е годы)» (абарона ў 2009 г., пераабарона ў 2013 г.). Даволі блізкія да гісторыі навукі кандыдацкія дысертацыі яшчэ двух супрацоўнікаў кафедры: А.А. Загорнава «Цензурная политика самодержавия в Беларуси в первой половине XIX в.» (1997) і І.Э. Яленскай «Документы немецко-фашистских оккупационных органов управления и учреждений как исторический источник (по материалам Госархива Брестской области)» (1999).

Далейшае развіццё навуковых пошукаў у дадзеным напрамку мела вынікам абароны доктарскіх дысертацый А.В. Пятроўскай «Высшая школа Болгарии и Польши в период социально-экономических преобразований 1945−1989 гг.: сравнительно-исторический анализ» (2007 г.) і І.І. Шаўчуком «Кадры гуманітарных навук БССР: станаўленне, фарміраванне, развіццё (20–30-я гады XX ст)» (2009 г.). У кантэксце прыярытэтных даследаванняў дацэнт кафедры У.В. Здановіч абраў у якасці тэмы доктарскага даследавання гістарыяграфічнае вывучэнне гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Вынікі сваіх навукова-даследчых высілкаў практычна ўсімі тагачаснымі супрацоўнікамі кафедры прадстаўлены ў апублікаваных манаграфіях [2; 4; 5; 9–11].

На сучасным этапе дзейнасць супрацоўнікаў кафедры па вывучэнні гісторыі навукі падтрымала і стымулявала пэўным чынам пазітыўная ацэнка папярэдніх здзяйсненняў навуковай грамадскасцю краіны і дзяржаўнымі інстанцыямі. Гэта выявілася ва ўдзеле выкладчыкаў, студэнтаў і магістрантаў факультэта ў выканання задання «Гісторыя гуманітарных навук у Беларусі (1920–1930-е гады)» (кіраўнік – І.І. Шаўчук), якое рэалізоўвалася ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя,

культура, грамадства, дзяржава». З мэтай інфармавання навукоўцаў ўніверсітэта і са спадзяваннем зацікавіць іх вынікамі працы часовага навуковага калектыву (далей − ЧНК) ніжэй змесцім своеасаблівую канспектыўную справаздачу (канспектыўную таму, што поўная мае значна большы аб'ём).

На працягу трох гадоў працы над заданнем у яго выкананні, за выключэннем кіраўніка, узялі ўдзел дацэнты кафедры кандыдаты гістарычных навук А.А. Башкоў, А.А. Савіч, студэнткі В.С. Ануфрыкава і М.С. Зыгмантовіч, магістрантка К.М. Лютыч. Праца размяркоўвалася па трох гадавых этапах: «Фарміраванне кадравага патэнцыялу гуманітарных навук» (2011 г.), «Вучоныя-гуманітарыі ў другой палове 1920-х – 1930-я гады» (2012 г.), «Структура навуковых і навукова-педагагічных устаноў» (2013 г.). У сваю чаргу кожны з іх падраздзяляўся на драбнейшыя этапы з вызначэннем асноўных тэматычных накірункаў:

1) 2011 г.: дадзена агульная характарыстыка перыяду, які вывучаўся, і ўмоваў стварэння кадравага забеспячэння навукі, працэсу прыцягнення вучоных з іншых рэгіёнаў для сталай працы ў рэспубліцы, падрыхтоўка новай генерацыі даследчыкаў да стварэння аспірантуры;

2) у 2012 г. увага ЧНК канцэнтравалася на вывучэнні колькаснага і прафесійнага складу гуманітарыяў, іх дэмаграфічнай характарыстыцы, падрыхтоўцы вучоных праз аспірантуру і дактарантуру («акадэмічную аспірантуру»);

3) намаганні ЧНК на працягу 2013 г. канцэнтраваліся на даследаванні гісторыі стварэння сістэмы ўстаноў гуманітарнага профілю ў 1920–1930-я гг., станаўлення і развіцця дзяржаўнай сістэмы атэстацыі вучоных, сацыяльна значных вынікаў навуковых даследаванняў.

Даследаванне зазначанай праблемы абапіралася на найноўшыя тэарэтычныя дасягненні айчыннай і замежнай думкі ў галіне навуказнаўства і гісторыі навукі. У прыватнасці, раскрыццё заяўленай тэмы праводзілася праз прызму паняцця «навука як сацыяльны інстытут». Гэта значыць, гісторыя гуманітарных навук аналізавалася не столькі як працэс назапашвання непасрэдных канкрэтных ведаў, а як адна з сацыяльных падсістэм з пазіцый высвятлення яе дзеяздольнасці, магчымасці самарэалізацыі ў канкрэтных грамадска-палітычных і эканамічных варунках, іх узаемаўплыву і ўзаемаабумоўленасці. Таму асноўная ўвага скіроўвалася на сістэму дачыненняў з іншымі сацыяльнымі інстытутамі, на ўзаемадачыненнях унутры навуковай супольнасці і вучоных з уладнымі інстытуцыямі. Пры выкарыстанні такога падыходу аказалася магчымым не толькі раскрыць заяўленую тэму, але і стварыць грунт для разумення навукова-арганізацыйнай сітуацыі ў наступныя дзесяцігоддзі.

Адсутнасць навуковых традыцый на працягу амаль 100 гадоў абумовіла перайманне большасці мерапрыемстваў, якія ажыццяўляліся ў Расіі, дзе адбывалася ломка старых і пошук новых формаў кіраўніцтва і забеспячэння навуковай дзейнасці. Па расійскай аналогіі ў Беларусі створаны Навукова-літаратурны аддзел (НЛА) і пры ім Навукова-тэрміналагічная камісія (НТК), пазней – Акадэмічны цэнтр. Устаноўлена, што ўжо тады пачынаюць закладвацца асновы інстытуцыі, створанай восенню 1921 г., якая атрымала назву Інстытут беларускай культуры (ІБК).

У працэсе даследавання спосабаў і формаў стварэння кадравага патэнцыялу гуманітарных навук выяўлена, што на пачатковым этапе яго фарміраванне адбывалася за кошт прыезджых спецыялістаў, прычым небеларусаў не толькі па паходжанні, але і па этнічнай самаідэнтыфікацыі. Па сведчанні У.І. Пічэты, ніводны прафесар з беларускімі каранямі са стажам дарэвалюцыйнай універсітэцкай працы не пагадзіўся на прыезд

у БССР пры адкрыцці БДУ ў 1921 г. Неабходна таксама мець на ўвазе тую акалічнасць, што Кастрычнік 1917 г. стварыў умовы рэкрутавання ў НДІ і ВНУ асоб, якія папярэдне навуковай дзейнасцю прафесійна не займаліся. Разам з тым у Беларусі праводзілася такая дзяржаўная палітыка ў сферы навукі, якая была накіравана на больш хуткую мадэрнізацыю, а значыць, абумоўлівалася прагматычным падыходам да фарміравання і развіцця кадравага патэнцыялу, які найлепшым чынам мог рэалізаваць задачы, пастаўленыя перад гуманітарыямі камуністычнай партыяй. Асаблівасць беларускай сітуацыі выявілася ў тым, што пры фактычнай адсутнасці навукоўцаў, якія займаліся гуманітарнымі даследаваннямі, была пастаўлена задача стварэння навукова-кадравага корпусу, які змог бы ажыццявіць вывучэнне комплексу гуманітарных дысцыплін, даследаванне якіх акцэнтавалася асабліва. Такая палітыка стала прыносіць першыя адчувальныя вынікі з сярэдзіны 1920-х гадоў.

Навукова-арганізацыйнае будаўніцтва ў Беларусі абумоўлівалася ажыццяўленнем яго ў перыяд сацыялістычнай мадэрнізацыі і актыўных працэсаў завяршэння нацыятварэння, якія цесна перапляталіся. Таму асаблівае значэнне надавалася гуманітарным дысцыплінам, што выявілася ў галіне вышэйшай адукацыі і ў стварэнні навукова-даследчых устаноў. Упершыню пасля разбурэння папярэдніх формаў вышэйшай адукацыі і навукі яны вярнуліся, але ў іншых формах, вызначаных планамі фарсіраванай пабудовы сацыялістычнага грамадства. Стварэнне навучальных і навуковых устаноў заканамерна спараджала кадравы дэфіцыт. Для вырашэння праблемы запрашаліся даследчыкі з РСФСР і падрыхтоўваліся свае маладыя спецыялісты. Практычна ўсе прафесары БДУ былі прыезджымі. Не ўсе яны пагадзіліся на пераезд у Мінск для сталай працы, таму яшчэ да 1927 г. універсітэт страціў 14 прафесараў. Прычынай паслужыла матэрыяльная незабяспечанасць. Меліся і іншыя матывы нежадання прыязджаць ці заставацца ў БССР: адсутнасць жылля, «становішча пры мяжы», вялікая занятасць на асноўным месцы працы, непаразуменні з беларускім кіраўніцтвам (беларусізацыя). Вынікам стаў перманентны недахоп выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў.

Перагляд у канцы 1920-х гг. поглядаў на шляхі і тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва прыводзіць да адпаведнага спосабу функцыянавання навукі. Сэнс заключаўся ў інтэнсіфікацыі вытворчасці і больш актыўнай навукова-арганізацыйнай дзейнасці. Так, падчас рэарганізацыі буйных ВНУ ў 1930/31 навучальным годзе педагагічны факультэт БДУ стаў асновай трох інстытутаў, дзе прысутнічаў гуманітарны складнік: МВПІ, Магілёўскага палітыка-асветнага і МагПІ. Арганізацыя (рэарганізацыя) БАН была праведзена па прыкладзе Камакадэміі, а не АН СССР. Гэта абумоўлівалася тым, што маладая нацыянальная акадэмія, дзе дамінавалі гуманітарныя і сацыяльныя даследаванні, павінна была браць прыклад з акадэміі камуністычнай, дзе як раз апрабавана новая сацыялістычная навука і яе арганізацыя. Супярэчлівасць сітуацыі заключалася ў адначасовым разгорнутым навукова-арганізацыйным будаўніцтве і хістаннямі ў навуковай палітыцы, выкліканымі імкненнем дасягнуць поўнай агульнасаюзнай ідэйна-палітычнай уніфікацыі, чаму былі заклікани служыць гуманітарныя навукі.

У выніку праведзенай доследнай працы выкрытыя прычыны калізій ва ўзаемаадносінах ўнутры навуковых калектываў. Падставай для іх служыла тое, што рускія выкладчыкі не аддзялялі Беларусь ад Расіі, маючы на ўвазе толькі нязначныя этнаграфічныя асаблівасці, таму не выказвалі сур’ёзных адносін да беларусізацыі, лічачы яе непатрэбнай. Адпаведна «пераважалі русіфікатарскія настроі, якія абапіраліся на пераважна рускі склад навуковых работнікаў сярод прафесуры». Разам з расійскім у Беларусі дзейнічаў яшчэ адзін нацыянальны фактар – яўрэйскі. Спробы больш актыўнага ажыц-

цяўлення беларусізацыі выклікалі арганізаваны сумесны адпор з боку рускіх і яўрэйскіх навуковых работнікаў [6, арк. 348].

Разам з тым у шэрагу выпадкаў змянялася і пазіцыя самой рускай навуковай інтэлігенцыі, перш за ўсё гуманітарнай. У інфармацыі камісіі ЦК ВКП(б) па праверцы беларускай партарганізацыі на чале з У.П. Затонскім (1929 г.) адзначалася наступнае: «Выпадкі адкрытага супраціву акадэмічнаму росту беларусаў ужо рэдкія ў ВНУ. Нярэдка самі прафесары іх вылучаюць. Некаторыя сталі выступаць за беларусізацыю: праф. Замоцін, Васкрасенскі, Пічэта з прамых праціўнікаў беларусізацыі ператварыліся ў асобных выпадках у непасрэдных ініцыятараў і выразнікаў нацыяналістычных настрояў часткі беларускай інтэлігенцыі» [8, арк. 59]. Таксама адзначалася варожасць да ўсяго беларускага з боку яўрэйскіх навуковых работнікаў: карэнізацыя навукоўцаў, незадаволенасць «недастатковым» камплектаваннем Акадэміі навук яўрэямі і г.д. [7, арк. 13–14]. У выніку мела месца супрацьстаянне паміж рускімі і яўрэямі з аднаго боку, і беларусамі – з другога: нават у 1920-х гг., у перыяд вялікага недахопу навуковых кадраў, ідзе выцясненне з рэспублікі рускіх і яўрэяў як з прычыны «чужога» сацыяльнага паходжання, так і па прычыне залішне прарасійскіх палітычных поглядаў ( Я.Ф. Карскі). Аднак уяўляецца, што большая ці меншая колькасць прыезджых рускіх прафесараў, іх стаўленне да беларусізацыі ў 1920-х гг. не з’яўляецца самастойным ацэначным фактарам. Не меншай увагі заслугоўвае тое, які практычны ўклад быў зроблены імі ў развіццё вышэйшай адукацыі і навукі ў Беларусі. Такім чынам, істотны ўплыў Расіі ў справе станаўлення вышэйшай адукацыі і навукі ў БССР у 1920–30-я гг. відавочны: калі ў 1920-я гг. ён пераважна праяўляўся праз носьбітаў дарэвалюцыйных навуковых традыцый, то ў наступнае дзесяцігоддзе – праз уніфікацыю вышэйшай адукацыі і навукова-гуманітарных даследаванняў (арганізацыйна і канцэптуальна) на базе расійскага фактару.

Даследаванне праблемы паказала, што развіццё эканомікі ва ўмовах нэпа, паступовая рэалізацыя новай нацыянальнай палітыкі (беларусізацыя і карэнізацыя) у значнай ступені паўплывалі на навуку, ствараючы ёй спрыяльныя ўмовы для развіцця праз выказванне розных канцэптуальных палажэнняў, прапанаваных гуманітарыямі. Такое супадзенне палітыка-ідэалагічных і эканамічных фактараў спрыяла развіццю НДІ, у т.л. нацыянальных (ІЯПП, ІППК, ІНМ), вышэйшых навучальных устаноў. Чарговы этап навукова-арганізацыйнага развіцця абумоўлены новымі тэндэнцыямі ў палітычным і эканамічным жыцці СССР. Культурная рэвалюцыя, непасрэдна звязаная з сацыялістычнай індустрыялізацыяй і суцэльнай калектывізацыяй, закранула і навуку. Для характарыстыкі яе становішча выдзелены наступныя моманты: 1) абсалютнае падпарадкаванне дзяржаве і ліквідацыя акадэмічных вольнасцяў; 2) магчымасць выдалення з навукі тых вучоных, «чыя дзейнасць відавочна скіраваная на шкоду БССР альбо саюзных рэспублік»; 3) паколькі навука фінансавалася выключна дзяржавай, яна павінна была існаваць у рэчышчы агульнага народнагаспадарчага планавання, што вызначала неабходнасць усеагульнага навуковага планавання.

Новая партыйная лінія праявілася ў першым масавым палітычным працэсе пад назвай «Саюз вызвалення Беларусі». Гэты і іншыя працэсы, скіраваныя на знішчэнне носьбітаў нацыянальнай свядомасці, непазбежна закраналі навуку. Такім чынам, гуманітарныя дысцыпліны апынуліся пад двайным ударам: 1) яны мусілі карэнным чынам перабудоўвацца ў рэчышчы ідэйна-тэарэтычных уяўленняў дзяржаўнага кіраўніцтва; 2) яны траплялі пад жорсткі кантроль з прычыны вялікай ролі, якую адыгрывалі ў нацыятварэнні.

З праведзенага даследавання лагічна вынікае выснова пра непасрэдны ўплыў палітычнай сітуацыі на навуковую актыўнасць. У дадзеным кантэксце важна ўлічыць яшчэ адзін момант: адбывалася не толькі фізічнае, але і прафесійнае знішчэнне вучоных. Бесперапынныя чысткі 1930-х гг. не толькі мелі вынікам незаменныя страты навуковых работнікаў, але і стрымлівалі працэс натуральнага развіцця кадравага патэнцыялу.

Пры выкананні задання членамі ЧНК праводзіўся збор матэрыялаў для складання хронікі найважнейшых падзей з гісторыі навукі ў Беларусі. З гэтай мэтай былі апрацаваны больш за 500 дакументаў НКА БССР, Галоўпрафадукацыі, Галоўнавукі (НАРБ, фонд 42), БДУ (НАРБ, фонд 205), ЦК КП(б)Б (НАРБ, фонд 4п), прадстаўніцтва ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б (НАРБ, фонд 242п), Гістпарта, ІГПКР (НАРБ, фонд 60п), ІБК, БАН, іх структурных падраздзяленняў (ЦНА НАНБ, фонды 1, 67). Дзякуючы гэтаму да 85-годдзя ўстановы падрыхтавана да друку дакументальнае выданне «Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Хроніка падзей. 1929−2014» (5 друкаваных аркушаў). Яно, на жаль, не апублікавана па прычынах, не залежных ад аўтараў-складальнікаў.

Значная ўвага адведзена навуковым персаналіям. Усяго складзена 235 біяграмаў навукоўцаў-беларусаў, а таксама тых, хто займаўся вывучэннем Беларусі як у ёй самой, так і за межамі рэспублікі. Біяграмы даследчыкаў уключаюць у сябе розную інфармацыю: прозвішча, імя, імя па бацьку, месца і даты нараджэння і смерці, адукацыя, прафесійная дзейнасць (рэгіён, горад, установа), навуковыя ступені і званні. Наяўная база дадзеных можа ў перспектыве быць апублікаванай.

За перыяд існавання ЧНК зроблена значная праца па вывучэнні канкрэтных гістарыяграфічных пытанняў па гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі, гісторыі археалогіі, вынікі чаго цалкам або часткова адлюстраваны ў дзвюх манаграфіях: «Христианские древности Беларуси конца ХХ–XIV вв. (предметы христианского культа индивидуального использования)» (А.А. Башков, 2011) і «Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): гістарыяграфія праблемы» (А.А. Савіч, 2012). Усяго падрыхтавана 57 публікацый (2 манаграфіі, 29 навуковых артыкулаў у Беларусі і за яе межамі, 26 тэзісаў канферэнцый). Члены ЧНК узялі ўдзел у 46 канферэнцыях (29 міжнародных, 7 рэспубліканскіх, 6 рэгіянальных і 4 універсітэцкіх). У межах выканання задання 24 лютага 2012 г. арганізавана Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Гісторыя і традыцыі беларускай навукі (да 90-годдзя Інстытута беларускай культуры)» [1] і апублікаваны зборнік навуковых артыкулаў аб’ёмам 11 друкаваных аркушаў [3].

Удзел у працах, якія выконваліся ЧНК, стаў карыснай школай навуковай работы для студэнтаў і магістрантаў, у тым ліку і тых, хто фармальна ў яго склад не ўваходзіў. Дадзеная выснова пацвярджаецца напісаннем дыпломных работ і магістэрскіх дысертацый. Так, паспяхова абароненыя дыпломныя работы К.М. Лютыч «Гісторыя вывучэння матэрыяльнай культуры на тэрыторыі БССР у 20−30-я гг. ХХ ст.» (2011 г.; навуковы кіраўнік – А.А. Башкоў,) і М.С. Зыгмантовіч «Нумізматычны матэрыял ў археалагічных помніках Брэстчыны» (2013 г.; навуковы кіраўнік – А.А. Башкоў); магістэрскія дысертацыі К.М. Лютыч «Гістарычная праблематыка ў навуковых і грамадска-палітычных часопісах БССР (20−30-я гг. ХХ ст.)» (студзень 2014 г.; навуковы кіраўнік – І.І. Шаўчук,) і С.В. Ігнатовіча «Кадры гуманітарных навук Беларусі (другая палова 1940-х гг.» (студзень 2014 г.; навуковы кіраўнік – І.І. Шаўчук).

Такім чынам, навуковыя меркаванні і высновы, адлюстраваныя ў даследаванні, шматкроць апрабаваны на навуковых канферэнцыях і публікацыях дзякуючы таму, што фактычны матэрыял быў здабыты з верагодных архіўных і бібліятэчных крыніц, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, Цэнтральным навуковым

архіве НАН Беларусі, Прэзідэнцкай і Нацыянальнай бібліятэках Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі, і ўважліва верыфікаваны.

Вынікі навукова-даследчай працы, праведзенай членамі ЧНК, маюць важнае навуковае значэнне і шырокія перспектывы практычнага выкарыстання. Па-першае, яны могуць адыграць пазітыўную ролю ў развіцці некалькіх галін ведаў ці навуковых накірункаў, у тэарэтычнай і практычнай распрацоўцы праблем гісторыі гістарычнай навукі, лінгвістыкі, літаратуразнаўства, філасофіі і інш. Па-другое, яны прыдатныя для выкарыстання падчас чытання курсаў лекцый па гісторыі згаданых навук на гістарычных, філалагічных, філасофскіх факультэтах і аддзяленнях айчынных ВНУ. (Дарэчы, вынікі працы ужо знайшлі ўкараненне ў адукацыйным працэсе, што пацвярджаецца трыма актамі ўкаранення. Яны выкарыстоўваюцца на гістарычным факультэце БрДУ імя А.С. Пушкіна пры чытанні курсаў і спецкурсаў «Гістарыяграфія гісторыі», «Метадалогія гістарычнай навукі», «Асновы археалогіі», «Хрысціянская археалогія», «Музеязнаўства», «Архівазнаўства», «Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў 1921−1939 гг.», «Сацыяльная гісторыя гуманітарных навук у Беларусі (1920−1930-я гады)»). Па-трэцяе, вынікі навуковага даследавання карысныя для выпрацоўкі практычных рашэнняў органаў дзяржаўнай улады і кіравання (пры наяўнасці іх зацікаўлення) па ажыццяўленні рацыянальнай палітыкі ў галіне навуковай дзейнасці (вызначэнне прыярытэтных напрамкаў даследаванняў, структура навуковых устаноў і падраздзяленняў, сістэма атэстацыі вучоных, фінансаванне гуманітарных навук, аптымізацыя дзяржаўных праграм і г.д.) і ўдасканалення адукацыйнай палітыкі (геаграфія вышэйшай школы, камплектаванне студэнтамі, тэрміны навучання і праграмы, месца і значэнне г.зв. сацыяльна-гуманітарнага блока ў навучальным працэсе, вучэбная нагрузка, навукова-даследчая праца ў ВНУ і інш.). Відавочна, што без уліку гістарычнага вопыту нельга паспяхова рэалізаваць аб’ектыўна патрэбныя мадэрнізацыйныя мерапрыемствы ў жыццёва вызначальнай для грамадства і дзяржавы сферы – навуцы і вышэйшай школе.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Гісторыя і традыцыі беларускай навукі (да 90-годдзя Інстытута беларускай культуры) : матэрыялы рэсп. навук. канф., Брэст, 24 лют. 2012 г. / рэдкал.: І.І. Шаўчук (адк. рэд.), А.А. Савіч (адк. сакр.), А.А. Башкоў. – Брэст : Выд-ва БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2012. – 145 с.

2. Дядичкина, Н.Е. Международное научное сотрудничество Академии наук БССР (вторая половина 1950-х – 1980-е гг.) / Н.Е. Дядичкина. – Брест : БрГУ имени А.С. Пушкина, 2013. – 157 с.

3. З гісторыі навукі ў Беларусі (да 40-годдзя аддзела гісторыі навукі Інстытута гісторыі НАН Беларусі) : зб. навук. арт. / рэдкал.: І.І. Шаўчук (адк. рэд.), А.А. Савіч (адк. сакр.), А.А. Башкоў. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2012. – 187 с.

4. Загорнов, А.А. Цензура в Беларуси: законодательство и практика в первой половине XIX в. / А.А. Загорнов. – Брест : БрГУ имени А.С. Пушкина, 2006. – 118 с.

5. Здановіч, У.В. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Агляд крыніц і айчыннай гістарыяграфіі / У.В. Здановіч. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2012. – 283 с.

6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4п. – Воп. 1. – Спр. 2310. Протоколы заседаний коллегии агитационно-пропагандистского отдела ЦК

КП(б)Б, комиссий при отделе, еврейского бюро и пленума латышского бюро ЦК КП(б)Б, документы к протоколам. 21 сентября 1925 г. – 10 декабря 1926 г.

7. НАРБ. – Фонд 4п. – Воп. 1. – Спр. 4182. [Короткие справки] о политико-просветительной работе, ликвидации неграмотности, развитии белорусской художественной литературы и др., сведения о составе и численности аспирантов БССР на 5 апреля 1929 г. 26 мая 1928 г. – 28 мая 1929 г.

8. НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 104. Стенограммы заседаний национальной комиссии ЦИК БССР. 18 июля – 28 ноября 1931 г.

9. Петровская, О.В. Подготовка специалистов в вузах Болгарии и Польши в 1944–1989 гг. // О.В. Петровская. – Брест : БрГУ имени А.С. Пушкина, 2005. – 301 с.

10. Петровская, О.В. Комплектование вузов студенческим составом: социалистический опыт Болгарии и Польши в 1944−1989 гг. / О.В. Петровская. – Брест : БрГУ имени А.С. Пушкина, 2009. – 288 с.

11. Шаўчук, І.І. Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады XX ст.) / І.І. Шаўчук. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2007. – 279 с.

***Shevchuk I.I.* Historical and Scientific Research an the Department of the history of Slavic Peoples**

The work in the study of history of science, carried out at the Department of the history of Slavic peoples of the historical Faculty of Brest State University is reviewed in the article through the prism of fulfilling the assignment «History of the humanities in the Belarusian SSR (1920–1930's)». State research program «History, culture, society, state».

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 01.11.2014